# Гады ўзляцелі як арэлі

**Яго почырк (і ў прамым, і ў пераносным сэнсе) не зблытаеш ні з чым іншым. Уборыстыя літары, роўненькія радочкі. А яго аповесці, апавяданні, абразкі, адшліфаваныя майстарскай рукою, з пазнаваемымі вобразамі і дэталямі, без лішняга красамоўства.**

**Даніленка — адзін з пісьменнікаў, творчай лабараторыяй якіх доўгі час была рэдакцыя "Гомельскай праўды". З 1952-га па 1982 год працаваў тут Міхась Пятровіч. І зараз пісьменнік дасылае нам зрэдчас свае новыя творы. Мы друкавалі апавяданні "Казкі пра зоркі", "Будзь шчаслівай, Арынка!", "Павуцінка на верасе" і многія іншыя.**

**Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец Лоеўшчыны, аўтар 15 кніг, многія з якіх у савецкі час выйшлі тысячнымі тыражамі, Міхась Пятровіч застаецца верным свайму галоўнаму герою — чалавеку з народа. Яго аповесць "Апанаска Лугавы" прызнавалася аповесцю года, а гады два таму Даніленка стаў лаўрэатам літаратурнай прэміі імя Васіля Віткі.**

**У Любенскім мікраараёне Гомеля мы гадзіны дзве гутарылі з пісьменнікам напярэдадні яго 90-гадовага юбілею. Міхась Пятровіч падзяліўся, што два яго апавяданні з'явяцца ў "Вясёлцы", будзе артыкул у "ЛіМе". А днямі ён напісаў новае апавяданне "Рэклама ў ліфце".**



ФОТА АЛЕГА БЕЛАРУСАВА

## Замест уступу

— Адна паэтэса ў мяне запыталася: "А што з вашай дачнай хатай у вёсцы Пустая Града (я яе для сябе перайменавала ў Багатую) на Лоеўшчыне? Чаму б вам там не стварыць музей?

А я ёй у адказ: "І вадзіць туды ваўкоў і мядзведзяў... Дарэчы, мне вельмі спадабаўся радок Ганны Атрошчанкі "Гады ўзляцелі як арэлі", назаві ім артыкул...

## Згадкі пра класікаў

— Неяк я паехаў у рэдакцыйную камандзіроўку на Петрыкаўшчыну. Тутэйшы настаўнік Іван Усціновіч прапанаваў мне схадзіць да свайго калегі, які быў сведкам прыезду Якуба Коласа да дзеда Талаша. Той і сапраўды расказаў, што на свае вочы бачыў, як на Прыпяці прыставаў параход, ставілі на беразе сходні, па якіх ішоў Колас. Я даў артыкул у газету "Літаратура і мастацтва" пад назвай "Так пачыналася "Дрыгва".

Праз некаторы час заходзіць да нас у рэдакцыю заслужаны работнік культуры, ураджэнец Брагіншчыны Аляксей Слесарэнка (ён здымаўся ў фільме "Палескія рабінзоны" па аповесці Янкі Маўра) і кажа мне: "Напішы ліст сыну Коласа Данілу. Ён быў у "ЛіМе" і сцвярджаў, што Колас ніколі не сустракаўся з дзедам Талашом". Напісаў я коласаваму сыну і атрымаў ад яго адказ з парадай: "Калі будзеце яшчэ што пісаць, то зацвярджайце пячаткай у сельсавеце".

Потым неяк быў я ў Мінску. Хведар Жычка прапанаваў: "Ты рэдка наведваешся ў сталіцу, давай сходзім у музей Якуба Коласа". Пайшлі. Гады на першым паверсе размяшчаўся музей, а на другім жыў Даніла. Я з цікавасцю разглядаў вялізны коласаўскі кажух, узнагароды пісьменніка. Спускаецца Даніла і пытаецца: "А вы былі ў Мікалаеўшчыне?". "Не, — адказваю, — к свайму сораму я і Нёмана не бачыў". А ў музея на той час былі дзве машыны. Я падумаў, што сын пісьменніка распарадзіцца, каб нас звазілі ў Мікалаеўшчыну. А той толькі зазначыў, што "хутка ад вакзала адправіцца аўтобус..."

— Твардоўскага я бачыў у 1949-м. Ён быў госцем 2-га з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі, удзельнічаў у адкрыцці помніка Янку Купалу. Мацнейшы паэт!

## Перажытае

Перад вайной вучыўся ў Рэчыцкім педагагічным вучылішчы. Нас, маладых, заперлі сартаваць лісты фанеры на фабрыку. У пашпарты паставілі штамп. Гэта азначала, што нікуды не можаш вырвацца. Рукі ў мяне панарывалі ад той працы. Мы ж тады рыхтаваліся да вайны, фанера патрабавалася на вытворчасць самалётаў. Я адчуў, што памру там і пайшоў дадому з той фабрыкі. Каля Холмечы сустрэў маму: яна ішла насустрач. А ў небе ўжо фашысцкія самалёты. Мабілізацыя. Давезлі нас да Чонак. Давялося бачыць, як на тэрыторыі санаторыя хлопцы і дзяўчаты скачуць па клавішах піяніна, крышаць, ламаюць мэблю, каб нічога не засталося ворагу.

Накіраваліся пешым парадкам у бок Арлоўшчыны. Планавалася, што там, у тыле, будуць вучыць салдацкай справе. Галодныя ўсе, пры тым, што побач рухалася фурманка з прадуктамі. Доўга цярпелі голад, ды знайшоўся хлопец здаровы, ускочыў на тую фурманку і давай кідаць адтуль каўбасу. Адзін з камандзіраў паспрабаваў пальнуць з нагана ўверх. Ды дзе там! Што ён, перастраляе 200 чалавек? І тут раптам паведамленне: усім кіравацца ў свае ваенкаматы. Уяўляеце? Датупаць да Арлоўшчыны і вяртацца назад.

Пайшлі мы з адным хлопцам-земляком з пасёлка Бодры. Павязло: ваенны эшалон ішоў на Гомель, і маёр, пэўна начальнік поезда, дазволіў нам забрацца на адну з платформ. Там стаялі гарматы з прывінчанымі коламі. Змучаныя, з закапцелымі тварамі, мы палеглі каля тых колаў і прыехалі ў Гомель. Дамоў ішлі праз зарэчную зону, кіламетраў мо 40. Дабраліся да Уборак. Ідзем праз жыта. А тут едзе "эмка". Не будзеш жа хавацца. Далажылі, што вяртаемся з Арлоўшчыны. "Ідзіце дадому, — сказалі нам ваенныя з машыны. — Заўтра будзе абвестка". Мо праз дзень і атрымаў яе. І ў гэты раз адплываў на вайну на баржы па Дняпры з Лоева...

Пад Харкавам трапілі ў акружэнне. Раўніны там. Нямецкія самалёты прачэсваюць увесь час. Санбатаў няма. Калі паранены — канец. Адзін з нас быў больш вопытны, ваяваў яшчэ ў фінскую. Па яго парадзе мы ўтраіх лажыліся галава да галавы, нешта накшталт крыжа атрымлівалася. Каб адразу загінуць, не мучыцца. Ляжыш і чуеш толькі як кулі "шпок-шпок-шпок..." Разоў пяць быў шанц загінуць.

## Нашчадкі

— У мяне тры ўнукі, унучка і тры праўнучкі. Адна з іх, Насцечка, пайшла ў першы клас. І ў кніжцы-чытанцы знайшла апавяданне "Зімовая азбука" свайго "старога дзеда" (сына майго яна кліча "малады дзед"). І ўсім пра гэта пахвалілася. А праўнучка Арынка Касцючэнка (дачушка маёй унучкі) неяк прыйшла са школы (займаецца на Валатаве) са слязамі: той не ўдалося ўпэўніць сваіх равеснікаў, што Міхась Даніленка, аўтар апавядання ў школьнай кніжцы, яе прадзед. Залівалася слязамі з крыўды, што не паверылі!

Унука Мішу з Хойнікаў, як я жартую, трэба ўнесці ў кнігу рэкордаў Гінеса: ён не курыць, не ведае смаку гарэлкі і вучыцца, хоць і завочна, у Навазыбкаве, у філіяле расійскай сельскагаспадарчай акадэміі. Ужо на чацвёртым курсе.

## Героі

— Пасля трагедыі на ЧАЭС з Пустой Грады зрабілі трасу на Лоеў. А прыпынак аўтобусны размясцілі... ў лесе. Я напісаў заметку ў "Звязду" пад загалоўкам "Прыпынак для... ласёў". Яе не надрукавалі, а пераслалі на рэагаванне ў адпаведны аддзел аблвыканкама. Хутка прыпынак перанеслі бліжэй да людзей.

Мой унук Павел паехаў у вёску. Страчае суседа па прозвішчу Башмак. Той хваліцца: "Я папрасіў, каб перацягнулі прыпынак..." Назваў я яго Чаравіком, калярытны персанаж...

Неяк у часопісе "Беларусь" пісаў нарыс пра прафесара-моваведа Уладзіміра Анічэнку пад назвай "Бурліць Арліца". Гэта рэчка ў Чэхіі. Ён у Вялікую Айчынную быў там у палоне, працаваў на шахтах. Змог збегчы: дамовіўся з іншымі хлопцамі, лёг у ваганетку, яго вугалем прысыпалі. Потым удзельнічаў там у нацыянальным супраціўленні фашыстам... Анічэнка запрасіў мяне дамоў, дзякаваў за нарыс. Памятаецца, дзяліўся, што ў пачатковых класах яго вучыла на Магілёўшчыне маці Аркадзя Куляшова.

## Вучоба

— У 50-х гадах была Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў у Маскве, у якой надарылася ўдзельнічаць. Памятаю, як на палутарцы шафёр вёз мяне з Лоева праз Гарошкаў. Неаднаразова спыняліся, прыходзілася штурхаць машыну. Гразюка непралазная каля Гарошкава...

Цягнік тады рана прыбыў у Маскву. Хацеў я ў вакзал зайсці, каб час змарнаваць. А міліцыянер спыніў і кажа: "Вы ў Маскву ехалі? Вось яна, перад вамі..."

Гляджу, машын таксі стаіць мо 500. Вызначыў я больш чалавечнага па знешняму абліччу вадзіцеля, пацікавіўся, колькі ж каштуе, каб сталіцу пагледзець. Сума была не заваблачная. Сеў побач з таксістам, і прывітанне, Масква! Пачалі з вуліцы імя Горкага.

Саюз пісьменнікаў СССР знаходзіўся ў былым асабняку Герцэна. Запомніліся выступленні Іллі Эрэнбурга, Барыса Палявога і менш вядомых сённяшняму чытачу тагачасных лаўрэатаў Сталінскай прэміі Пятра Паўленкі (раман "Шчасце", кінасцэнарыі "Аляксандр Неўскі", "Падзенне Берліна"), Галіны Мікалаеўай (яе раман "Жніво" таксама атрымаў "сталінскую"). Барыс Палявы расказаў, як быў на Нюрнбергскім працэсе, калі судзілі нацысцкіх злачынцаў. Пасяджэнні вельмі працяглыя, міжволі кідала ў сон. Амерыканскія журналісты былі ў незвычайных акулярах, на якіх мелася выява вачэй. Яны і Палявому далі такія...

Я займаўся ў секцыі прозы Елізара Мальцава. Ён падарыў мне з аўтографам свой раман "Ад усяго сэрца", адзначаны Сталінскай прэміяй другой ступені.

## Рэдактары і калегі

Часта друкаваўся ў часопісе "Бярозка", рэдагаваў які празаік Усевалад Краўчанка. Намеснікам у яго быў Мікола Гамолка. Краўчанка, будучы ў адпачынку, даў тэлеграму Гамолку: "Бяры на працу Даніленку". Я і сапраўды планаваў пачаць там, бо на той час мы жылі ў Гомелі на прыватнай кватэры. Падсабраў грошай і паехаў у сталіцу. Пакуль былі грошы, і я быў харошы, як у той прымаўцы. Фінансы скончыліся. А каб трапіць у "Бярозку", трэба было прайсці яшчэ і ўзгадненне ў Пятра Машэрава, тагачаснага першага сакратара ЦК ЛКСМБ. Гэта азначала, што я павінен яшчэ на пэўны час затрымацца ў Мінску. І вярнуўся я ў Гомель. Зайшоў на Пушкіна, 5, у рэдакцыю "Гомельскай праўды" да Матыля: "Хачу ў вас працаваць. Я ўдзельнік вайны, быў у палоне..." Ён зірнуў на мяне з халадком. Тады я дапоўніў: "Я ж не ўтойваю гэты момант. І не я адзін такі. Расказаць вам, як тры арміі трапілі ў акружэнне..." Відаць, рэдактар спалохаўся, што я, як і іншыя наведвальнікі, доўга, з усімі дэталямі буду згадваць перажытае, таму адразу прыпыніў: "Возьмем вас..."

Калісьці я пісаў "Суб'ектыўныя заметкі пра рэдактараў" у "Гомельскую праўду".

Пасля Матыля быў Піліп Яхменаў. Ён пісаў вершы, кіраваў літаб'яднаннем... Южык быў своеасаблівы. Любіў, каб выседжвалі ад хвіліны да хвіліны ў рэдакцыі. А як жа матэрыял жывы, з жыцця ўзяць? Помніцца, падрыхтаваў нам супрацоўнік абласнога музея артыкул пра Ракасоўскага. Жыў аўтар на праспекце Леніна, хатняга тэлефона не меў. У гадзін сем вечара заходзіць Южык і кажа: "Тут напісана, што Ракасоўскі — член ваеннага савета фронта. Усумніцеся і праверце". А музей ужо зачынены, да аўтара не патэлефануеш. Пасядзеў я хвілін дзесяць у сваім кабінеце, потым зайшоў да рэдактара і сказаў яму, што звязаўся з аўтарам, ён пацвярджае. "О, добра-добра, даем у друк", — сказаў шэф.

З калег, з якімі працаваў, мне падабаліся Вадзім Цішкевіч і Уладзімір Стэльмах. Міша Высоцкі быў мне бы брат малодш...

**З пісьменнікам гутарыла**
**Тамара КРУЧЭНКА**

***Заўтра Міхась Даніленка адзначае 90-годдзе. З гэтай нагоды за шматгадовую плённую працу ў рэдакцыі "Гомельскай праўды" ветэран-журналіст і пісьменнік адзначаны ганаровай граматай газеты і грашовай прэміяй. Шчыра віншуем, Міхась Пятровіч! Як мага больш здароўя і бадзёрасці, новых твораў для землякоў!***